Цана асобнага нумару 20 гр.

Przesyłka opłacona ryczałtem

№ 32 Вільня, Нядзеля 17 Лістапада 1929 г. Год V (XIII).

Беларуская КРЫНІЦА

Палітычная, Грамадзкая і Літэратурная Газэта.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: ВІЛЬНЯ, Людвісарская 1-19. (Wilno. Ludwisarska 1-19) Рэдакцыя адчынена ад 9 гадз. да 4 гадз. веч.

„Бел. КРЫНІЦА" каштуе на год—6 зл., на паўгода — 3 зл., на 3 месяцы — 2 зл.. ГАЗЭТА ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ.

Цана абвестак: на 1-шай старонцы 60 гр., 2 і 3 — 50 гр., на 4-ай — 40 грш. — за радок дробнага друку ў адзэй шпальце

Камуністычная акупацыя на Беларусі.

Пачатак і развіцьцё камуністычнай улады на Беларусі мелі асаблівы характар: гэтая ўлада была заўсёды чужая, не беларуская. Камуністычную ўладу стварылі не беларускія сяляне і работнікі, але расейскае войска, якое стаяла тады на заходнім фронце і якое заняло Беларусь у 1919 і 1920 г.

Ужо ад пачатку лета 1917 году пасьля няўдалага наступленьня проціў немцаў пад павадырствам Керэнскага пачынаецца бальшавізацыя расейскага фронту. Салдаты баявацы ня хочуць, бо ня бачаць ніякай мэты і карысьці з вайны. Слова „мір" на вуснах у ва ўсіх. Бальшавікі стараюцца „разлажыць" фронт, старое войска і стварыць сваё новае бальшавіцкае. Гэта ім удаецца. Змучаны салдат кідае фронт і едзе да хаты. Астаюцца толькі тыя, каторыя згаджаюцца з бальшавіцкім парадкам — і такім чынам паўстаюць гэтак зв. „краснаармейцы" і „краснагвардзейцы". У „красных" аддзелах бальшавікі ўжо не дапускаюць ніякіх салдацкіх камітэтаў і не прызнаюць выбару ахвіцэраў — там пануе срогая дысцыпліна. Кожны, хто хоць піснуў пра свабоду і дэмакратызм у войску, быў срога караны, як вораг пралетарыяту.

Гэтакі працэс быў на ўсім фронце; гэтакі быў і на Беларусі. У Менску й па другіх большых гарадох Беларусі творацца чырвоныя аддзелы, якія стараюцца правесьці ў кастрычніку 1917 году бальшавіцкую рэвалюцыю. На чале гэтых аддзелаў сталі расейцы, часам латышы або нават і жыды.

У Менску „кастрычнікавая рэволюцыя" адбылася такім парадкам. На менскі вагзал пад'ехаў бальшавіцкі бранявы цягнік і паставіў гарадзкой радзе і ўсім менскім арганізацыям ультыматум: калі ў працягу 24 гадзін ня прышлюць адказу, што яны прызнаюць бальшавіцкую ўладу, бранявік пачне бамбардаваць горад... Гарадзкая рада ня бачачы іншага выхаду „здалася" і бальшавікі „высадзілі" з бранявіка ўжо гатовы „Рэвком" для Беларусі, якую называлі яны „Северозападной областью". Гэты „Рэвком" быў папоўнены менскімі бальшавікамі і „кастрычнікавая рэвалюцыя" на Беларусі адбылася... На чале ўлады стаў заядлы вораг беларушчыны нейкі Мясьнікоў і цяперашні „дабрадзей" Рад. Беларусі — Кнорын (сэкрэтар Бел. Камуністычнай Партыі), каторы любіў выражацца, што ніякай Беларусі не было, няма і быць ня можа!

Гэты ўрад разагнаў кулямётамі і штыхамі Усебеларускі Кангрэс у ночы з 30 на 31 сьнежня 1917 г.

Змагаеьне, спачатку ціхае паміж беларусамі і расейскімі камуністамі, якія прышлі на Беларусь рабіць рэвалюцыю і кіраваць ёю, разгараецца цяпер вялікім полымем. У Менску дзе-ня-дзе раздаюцца стрэлы. Беларусы прабуюць стварыць свае вайсковыя аддзелы і бараніцца. Але рашучаму выступленьню перашкаджаюць немцы, якія 20.II.18 г. займаюць Менск. Мясьніковых і Кнорыных ужо даўно няма — яны ўцяклі ў Смаленск, дзе стараюцца зарганізаваць свае сілы і паправіць абмылкі. Да гэтакіх абмылкаў залічылі і свае варожыя адносіны да Беларусаў...

Абмылкі пастанаўляюць паправіць, тымболей, што пры адыходзе немцаў ім хацелася вярнуцца ў Менск. З чым вярнуцца? Па што? Душыць ізноў Беларусаў?

Адкрыта рабіць гэтага неяк не выпадала, дык пастанавілі абвясьціць „незалежную" Савецкую Беларусь. Але хто мае абвясьціць і хто мае там праводзіць беларускую работу? Расейцы? Мясьнікоў або Кнорын? — Ізноў неяк не выпадала, дык паклікалі беларусаў: Жылуновіча і Чэрвякова, якія ўжо тады працавалі ў камуністычнай партыі. Жылуновіч быў назначаны старшынёю новага ўраду. Такім чынам пад напорам беларускага руху расейцы пачалі адступаць...

Тымчасам бальшавіцкае войска займала Беларусь. Гэтае войска ня было беларускім—яно было расейскім. Расейцы йшлі на Беларусь, як акупанты. Яны займалі наш край, каторы тады ўжо юрыдычна быў незалежны на моцы акту Рады Беларускай Народнай Рэспублікі, абвясьціўшай незалежнасьць 25.III.18 г. Затым бальшавіцкая ўлада была чыста акупацыйнай, а Беларусь — краем забраным. Што гэта ўлада ёсьць сапраўды акупацыйная, паказваюць яшчэ адносіны бальшавікоў да беларускага народу; бальшавікі заўсёды адносіліся да беларусаў, як да чужынцаў. Ня было ў іх спогаду, які мае свая ўлада да свайго народу, ня было запякаваньня Беларусяй, каб яе падняць гаспадарча, культурна і прасьветна. Беларусь асталася, як і пры царох, краем забраным — і толькі. Гэтак было й пры нямецкай акупацыі. Яшчэ болей пракаменеем ў гэтым, калі возьмем пад увагу хаця-б цяперашнія адносіны расейскіх культурных работнікаў. Ці-ж чыстая беларуская ўлада магла-б гэтак зьдзекавацца над беларускімі: культурнымі работнікамі, якія будуюць культуру роднай Беларусі? Ці адважылася-б яна крычаць да беларусаў: на калені — і цешыцца з таго факту, што сапраўды беларусы стаяць на каленях? Ці хацела-б іх біць і дабіць?

Ніколі! За тым мы ўважаем, што сапраўды камуністычная ўлада на Беларусі ёсьць уладай чужой і акупацыйнай. Беларусы ні ў партыі, ні ў урадзе ніякага голасу ня маюць, яны прымушаны слухаць чужых.

Цьвёрда і стойка дамагаймася роднае школы!

Кожны з нас стогне пад цяжкім ярмом гора. І кожны з нас чуе, чытае ды бачыць, як па ўсім сьвеце ўсе падняволеныя народы, на'т паўдзікія індыйцы, афрыканцы імкнуцца да палепшаньня свае горкае долі сваімі ўласнымі рукамі; як дабіваюцца належных сабе правоў за цану найбольшых ахвяр! Зьвернем увагу, як тыя-ж народы стойка змагаюцца за прасьвету ў роднай мове, каторую ўважаюць за адзін з першых важных здабыткаў на дарозе да вызваленьня! Як энэргічна, з нязьмернай ахвярнасьцю дабіваюцца яны роднае школы, гдзе прыгатоўляюцца адважныя, разумныя ды ахвярныя людзі за родную адраджэнскую справу! Усюды дабіваюцца роднае школы, бо яна навучыць дзяцей цаніць, любіць і бараніць гаротных бацькоў, ды ўсё сваё роднае, бо ў роднай школе выгадуюцца інтэлігенты, патрыёты, каторыя замест нясьці здабычы свае культурнае веды багатым чужынцам, прынясуць яе ў сваю-ж цёмную, убогую вёску, ды падымуць яе на вышэйшую культурную ступень!

Браты Беларусы! Прыйшоў і нам час узяць свой лёс у свае рукі ды праз арганізацыю і прасьвету стацца гаспадарамі на сваім родным загоне. Ці-ж мы горшыя за ўсіх!?

Родная школа павінна стацца прадметам нашых стойкіх і вытрывалых дамаганьняў!

Скажаце — трудна дамагацца? Так, трудна, але магчыма, бо маем правы! Праўда, канстытуцыйныя правы для нашага, беларускага школьніцтва абстаўлены навакол высока языковымі законамі.

Але мы, глыбока, вельмі глыбока зразумеўшы патрэбу роднае прасьветы, пастараймася знайсьці спосаб, як памагчы свайму гору!

А гдзе-ж той спосаб?

— *У нашай цьвёрдай народнай і грамадзкай сьведамасьці, адвазе ды станоўкасьці! У нашых вытрывалых і энэргічных дамаганьнях!*

Гэтым спосабам іншыя адкрылі сабе доступ да сваіх правоў.

Хто-ж нам забароніць мець тое, да чаго мы маем сьвятое права?!

Браты! Паслухайма, як з аднаго боку стогне тонучая ў цемнаце ды горы нашая вёска, а з другога — гляньма на народы: Літоўскі, Украінскі, Нямецкі, Жыдоў у Польшчы ды на тых нашых адважнейшых беларусаў, якія стойка і адважна боруцца з цемнатою народу і як яны ўрэшце дабіліся свайго! ..

А мы?... Мы можа, яшчэ ўсё, баімося, мы пазваляем сябе атуманьваць рожным бадзягам, каторыя нам плятуць пусьцячыну быццам у нас нямашака нашае ўласнае веды і культуры, сулячы сваю чужую нам культуру.

Здараюцца такія сумныя праявы, што сыны і дочкі нашага народу, пабыўшы ў чужой школе, пачынаюць ужо глядзець з пагардаю на нашую родную беларускую мову, на свой народ і народныя абычаі, каторымі нас абдарыла Божая прырода?!... Гляньма на нашу моладзь, каторая, ня маючы добрага кіраўніцтва, марнуецца, дзічэе, пдзе ў п'янства і разбой! Чаму гэтак дзеецца? Бо яе не

241096

навучылі працаваць для свайго гаротнага народу!

Які-ж стыд нам і перад Богам, і перад Бацькаўшчынай і перад усім культурным сьветам...

Дык Сяляне Беларусы, як праваслаўныя, так і каталікі! Заклікаем Вас! Дамагайцеся праўнаю дарогаю свае роднае школы!

Станьма цяпер, Браты, мурам з подпісамі і сьцьверджанымі праз войтаў дэкларацыямі перад школьнымі ўладамі *з цьвёрдым дамаганьнем беларускай урадавай школы!*

Будзьма гатовы перанясьці ўсякія перашкоды з боку няпрыхільных нам адзінак!

Ня боймася насьмешак, пагрозаў, не шкадуйма працы і трудоў, бо змагаемся за такія ідэалы, каторыя варты гэтага!

Да сонца прасьветы роднай, да культуры завём вас усіх, Браты Дарагія!

Да здабыцьця роднай беларускай школы заклікаем вас сяляне беларусы! Дык падавайце дэкларацыі школьным уладам на родную беларускую школу.

П. З.

З Беларускага жыцьця.

ПАД ПОЛЬШЧАЙ

Беларуская мова ў праваслаўнай царкве. Пятніцкая царква ў Вільні, пасьля доўгіх дамаганьняў віленскіх праваслаўных беларусаў, духоўнымі ўладамі ўрэшце аддана беларусам.

У гэтай царкве цяпер праведзены грунтоўны ўнутры рамонт. Пасьля рамонту пасьвяціў яе ўрачыста ў нядзелю 10 г.м. віленскі архіяпіскап Фядос. У часе ўрачыстага набажэнства сказана да народу навука пабеларуску. На набажэнстве царква была перапоўнена народам. Кожны слухаў слова Божага ў роднай мове беларускай з захапленьнем.

Гэты рэлігійны настрой слухачой паказвае, як ёсьць патрэбнай дзеля дабра беларускага народу і царквы беларуская мова ў царкве на Беларусі.

З дзейнасьці Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры. У мінулым тыдні заснаваліся новыя гуртки Б. І. Г. і К. у в. Малая-Боркаўшчына, Маладэчанскага павету і ў в. Крупелі, Шчучынскага пав.,

— 18 г. месяца адкрываецца пры цэнтральным Урадзе Б. І. Г. і К. бібліатэка-чытальня. У бібліатэку сабраны амаль-што ўсе беларускія кніжкі выданыя ў Вільні ад пачатку навейшага пярыяду беларускага адраджэньня. Ёсьць троха кніжак у іншых мовах аб Беларусі. Пачынены крокі дзеля здабыцьця беларускай літэратуры выданай за межамі Зах. Беларусі.

У чытальні будуць часопісі: беларускія, украінскія, польскія, расейскія і літоўскія. Бібліатэка будзе адчынена ад 5 да 7 г. вечара штодня — апрача сьвятаў і нядзель.

— На паседжаньні 3 г. лістапада Цэн. Урад пастанавіў адзначыць адпаведнай урачыстасьцю 400-я ўгодкі выданьня Літоўскага Статуту, які надрукаваны ў беларускай мове.

Судовае сьледства ў справе „Беларускай Крыніцы“. У мінулым тыдні судзьдзя следчы II вокругу на м. Вільню вызываў рэдактара Я. Пазьняка і дапытываў як сьведку, хто ёсьць аўтарам стацьці сканфіскаванай у нумары 23 „Б. Крыніцы“. На запытаньне рэдактара Пазьняка — чаму так пастаўлена справа, што ён у гэтай справе дапрашываецца як сьведка, а не як абвінавачаны — судзьдзя заявіў, што гэтак справу паставіў пракурор, каб даведацца, хто ёсьць аўтарам сканфіскаванай стацьці, бо пад той стацьцёй падпісаны літары „S. Ł.“ Рэч зразумелая, рэдактар Пазьняк ад такога паказаньня адмовіўся, заяўляючы, што яго абавязвае ў гэтай справе сакрэт, як рэдактара.

Новае беларускае таварыства пад назовам „Рунь“. Нядаўна паўстала Выдавецка-Асьветнае Кааператыўнае Т-ва, якое месьціцца ў Беластоку.

Паводле Статуту, гэнае Т-ва мае на мэце: 1) арганізоўваць і весьці гаспадарчыя прадпрыемствы, як-та: кнігарні, склады навуковых прылад і ўсялякіх прадметаў, неабходных у культурна-асьветнай дзейнасьці; 2) выдаваць уласным коштам часопісі і кніжкі, 3) весьці ўсялякага роду культурна-асьветную, а таксама грамадзкую дзейнасьць.

Аб „Лемантары“ Маеўскага апошнім часам выйшла кніжыца Паляшчука „Некалькі ўваг аб беларускім“ „Лемантары“ Ст. Любіч-Маеўскага (выд. Т-ва „Рунь“ у Беластоку), каторую ўлады на чацьверты дзень пасьля выхаду з друку сканфіскавалі і Ул. Самойлы „Skandaliczny Elementarz“ (адбітка з № 18-19 „Przeglądu Wilenskiego). Кніжыца гэта грунтоўна разьбірае ўсю бязглуздасьць гэнага „Лемантара“, якім палякі хацелі карміць наш народ.

Дзесятыя ўгодкі сьмерці Івана Луцкевіча. У дзесятыя ўгодкі сьмерці Івана Луцкевіча, якія прыпадалі 20 жніўня с. г. былі адпраўлены набажэнствы ў Вільні: у касьцеле сьв. Мікалая і ў сьв. Троіцкай царкве. Некаторыя вучыцялі Віленскай Беларускай Гімназіі супольна з Беларускім Студэнцкім Саюзам ладзяць гэтую ўрачыстасьць абходу дзесятых угодкаў сьмерці Івана Луцкевіча цяпер 17 лістапада с. г. Дзеля абходу гэтага сьвята ўтвораны камітэт, на чале якога стаіць грам. А. Трэпка.

Крамка Янкі Станкевіча — „Гаспадарскі Зьвяз“ разваліваецца. Віленскія газэты падалі, што „колы“ Янкавага „Зьвязу“ параскідаліся ў Ашмянскім павеце; у м. Барунах і ў в. Гіняўцах. Як чуваць у тых „колах“ усе: і старшыні, сэкрэтары, і скарбнікі, і іх заступнікі і сябры паадракаліся ад сваіх становішч, заяўляючы, што былі ашуканы і што гэтая крамка — „Зьвяз“ створаны толькі на тое, каб баламуціць беларускіх сялян. Выступіўшыя заклікаюць усіх сяброў „Зьвязу“ зрабіць тое самае.

Але пытаньне, куды яны цяпер пахіляцца? Каб часам ізноў не пайшлі блудную дарогаю!

Як бачым, дык полёнафільства сярод беларускага сялянства не прыжывае. Полёнофілы з віленскага бруку ніяк ня могуць выйсьці на прастор беларускай вёскі.

З РАДАВАЙ БЕЛАРУСІ.

Новы віцэ-старшыня і неадменны сэкрэтар Беларускай Акадэміі Навук. Як падае „Зьвязда“ з дн. 29.X.29 Савет Народных Камісараў зацьвердзіў рэкамандаваныя Беларускай Акадэміяй Навук кандыдатуры Якуба Коласа на пасаду віцэ-старшыні Бел. Акадэміі Навук, І. А. Пятровіча на пасаду неадменнага сэкрэтара і А. М. Платуна з С. Ю. Ашаровічам на сябраў прэзыдыуму Бел. Акадэміі Навук.

Такім чынам цяперашні склад прэзыдыуму Бел. Акад. Навук выглядае так: Ігнатоўскі — прэзыдэнт (старшыня) Бел. Акадэміі Навук, Бялуга — віцэ-прэзыдэнт, Якуб Колас — другі віцэ-прэзыдэнт, Пятровіч — неадменны сэкрэтар, Матулайціс, Некрашэвіч, Ашаровіч і Платун — сябры прэзыдыуму Бел. Акадэміі Навук.

Як бачым на становішча неадменнага сэкрэтара назначаны няведамы Пятровіч на мейсца В. Ластоўскага, які папаў у няласку бальшавікоў быццам за „нацыянал-дэмакратызм“.

Трэба прывітаць назначэньне Якуба Коласа на становішча віцэ-старшыні Бел. Акад. Навук. Мусіць камуністы гэтым назначэньнем хочуць паказаць, што яны не праследуюць беларусаў! Будзем глядзець, як камуністы будуць далей адносіцца да беларусаў. Ходзяць чуткі, што Цішку Гартнага (Жылуновіча) выслалі з Беларусі недзе ў цэнтральныя губэрні.

Друкарскія памылкі.

У нумары 31 „Б. Крыніцы“ праз недагляд папалі друкарскія памылкі: у першай стацьці, 12-ты радок, дзе замест 280 нумару „Кам. Праўды“ павінна быць 180; ў карэспандэнцыі з в. Попаяў у 18 радку надрукавана „у гуртках“, а трэба „у гутарках“.

Дзьве мапы.

Сёлетняга 1929 году, некулькі месяцаў таму, коштам „Instytutu Badań Spraw Narodowościowych“ у Варшаве, вышла ў сьвет кніжыца пад загалоўкам „Mapy rozsiedlenia ludności polskiej i litewskiej na terenie Republiki Litewskiej i na obszarach północno-wschodnich Rzeczypospolitej Polskiej“. Пасярод гэных дзьвёх мап знаходзіцца так-жа адпаведнае да іх выясьненьне.

Ад выхаду ў сьвет гэных мап мінула ўжо некулькі месяцаў, а беларуская грамадзянства, здаецца, не зьвярнула на іх увагі. „Бел. Крыніца“, дзеля матэр'яльных труднасьцяў, выходзячы праз лета і восень радзей як заўсёды, а так-жа і заўсёды выходзячы ў даволі цесных рамках, у свой час не магла ў справе гэных мап забраць голасу. Вось-жа згодна з прыказкай: лепш позна, як ніколі, тым больш, што мап гэных абыйсьці маўчком ня можна, мы аб іх падаём да публічнага ведама грамадзянства хоць гэтых некулькі ўваг.

Першая мапа паказвае нам працэнтны лік палякоў, як на тэрыторыі сучаснай незалежнай Літвы, так і на літоўска-беларускіх землях, паложаных на ўсход і поўнач, на моцы Рыскага трактату 1921 году належачых да Польшчы і прылягаючых да сучаснай літоўска-польскай граніцы. Землі гэныя становяць наступныя 8 паветаў: Сувалкі-Сэйны, Горадня, Ліда, Вільня-Трокі, Ашмяна, Сьвянцяны, Браслаў і Дзісна.

Другая мапа ёсьць, казаў-бы, адваротнай старонай першай. Яна падае працэнтны лік літоўцаў на тэрыторыі незалежнай Літвы і на літоўска-беларускіх землях успомненых паветаў сучаснай Польшчы. Яны абедзьве ўзаемна дапаўняюцца і становяць, рэч зразумелая, цэласьць.

З гэтых мап і аб'ясьненьняў да іх даведываемся, што ў незалежнай Літве палякоў ёсьць не 64105 (3,2%), як падае ўрадавая літоўская статыстыка, але 202026 (9,99%), як аблічае польскі Цэнтральны Выбарны Камітэт у Літве. Далей з тых-жа мап даведываемся, што на 1.120 000 жыхароў успомненых паветаў пад Польшчай знаходзіцца літвіноў не прыблізна 300 тысяч, як лічаць літоўцы (Natio Nr. 1 art. D-ra Alsejki: „Przeszłość i teraźniejszość litwinów w Wilenszczyźnie“), а толькі 75 тысяч (6,7%), палякоў-жа 791 тысяча (70,6%).

Першай падставай да такой карыснай для Польшчы статыстыкі насяленьня літоўска-беларускіх зямель гэных паветаў „Instytut Badań Narodowościowych“ уважае тое, што быццам гадоў таму 500, як агулам, так асабліва ў даплывах Вялі палякоў, як асаднікаў, так і палонных асела ў дужа вялікім ліку і што яны сяньня вырасьлі ў такую вялікую грамаду. Вось-жа, калі возьмем пад увагу навуковую беспадстаўнасьць гэнага ліку польскіх даўнейшых асаднікаў і палонных і гэны, казаўбы, цудоўны іх рост, а навет перарост адвечных жыхароў сваей зямлі літоўцаў і беларусаў, і калі далей прыпомнім, што Інстытут, знаходзячы ў нашым краі так шмат прыродных палякоў, ані слоўца не сказаў аб полёнізацыі літоўцаў і беларусаў, асабліва ад Люблінскай уніі 1569 г. і аж да пачатку XX сталецьця і калі ўрэшце возьмем пад увагу, што з пачаўшымся ў XIX сталецьці і аж да сяньня адбываючымся адраджэньнем літоўскага і беларускага народу цэлыя масы літоўцаў, беларусаў варочаліся і варочаюцца да свайго бацькаўскага народнага пня, што так-жа Інстытут абышоў маўчком — калі гэта ўсё прыпомнім, дык ясна ўбачым усю беспадстаўнасьць і яўны разыход з праўдай „Instytutu Badań Narodowościowych“.

Бліжэйшай і галоўнай падставай для яго аблічэньняў палякоў у незалежнай Літве была расейская статыстыка з 1897 г., якая ў бышай Ковенскай губ. налічала палякаў 9,1%, спіс урадавы літоўскі з 1923 году (без Клайпэды), які налічыў палякоў 64105 (3,2%) і спіс польскага Цэнтр. Выбарчага Камітэту ў Літве, налічаючы палякоў 202026 (9,99%).

Вось-жа гэта статыстыка — далёка ад праўды. З яе мы бачым, што Палякі прынялі, як найбольш слушны, расейскі рахунак палякоў, дапоўнілі яго прыродным прыростам і атрымалі *пажаданы* лік палякоў, перавышаючы ўсялякія статыстыкі. Але трэба помніць, што расейцы яшчэ ў тым часе вялікі лік каталікоў у нашым краі, як літоў-

М. Марвіч.

Пара ўжо з каленьняу устаць.

„...Большую войну с пролетариатом он (национал-демократизм) проиграл, и притом безвозвратно. Революция поставила его на колени... На колени. Так, на колени! Он будет бунтовать на коленях!
А там видно будет...“
„Комсомольская Правда“ № 180/29.

Над краем Крывіцкага люду
Кружыліся хмары „крукоў“,
Шукалі пажывы прыблуды
Ад даўных ўжо даўных вякоў.
Народ наш быў сілен бяз меры:
Навалу „крукоў“ адганяў,
Аднак-жа прышоў той дзень шэры
І сам у палон сябе даў.
Нас цар закаваў на „заўсёды“
І з вольных паробіў рабоў,
Пазбавіў зусім нас свабоды,
І гвалтам рабіў маскалёў.
Аднак-жа прышоў час на цара —
І трон яго моцны зьляцеў;
Была гэта Божая кара,
І ўсіх паняволеных гнеў.
Свабода усім загрымела,
Хто толькі яе зажадаў;
Кроў братня руч'ямі ляцела
Свабоду так „раб“ здабываў.
Пачуліся крыкі: „Ўсе роўны!
Свабода усім, хто жыве,
Усякі дабра будзе поўны,
Хто царскія путы парве!
Мы так-жа ішлі вызваляцца
З народамі ўсімі ў рады.
„Народам вы можаце звацца!“
Казалі усе нам тады.
Мы ім памаглі разваліці
Магутны трон іхных цароў:
Стары лад ішлі мы бурыці,
Каб больш ня было ланцугоў.
І вось пасьля той завярухі,
Як лопнулі путы ўва ўсіх,
Паўсталі народныя рухі,
Бо кожны стаў клікаць сваіх.
Так кожны народ вызначаўся —
Тварыў ён дзяржаву сваю.
Ад Крэмлю хутчэй аддзяляўся
І ўласну тварыў ўжо сям'ю.
І мы так-жа-сама рабілі,
І наш азначаўся народ,
Аднак-жа Саветы зглумілі
Ў зародку Народны наш Сход.
Дзе-ж словы вялікай свабоды?
Дзе роўнасьць, дзе брацтва усіх?
Ізноў закавалі народы
У путах чырвоных сваіх.
Там думкі свабоднай ня маюць,
І праўды ня можна сказаць,
За праўду ў Салоўкі ссылаюць,
Дзе доўга ты будзеш канаць.
І вось там свабода і роўнасьць:
Стаіць на каленях мужык!

Дык дзе-ж тут жыцьця яго поўнасьць?!
Ня ўчуеш яго нават крык.
Над ім стаіць „барин“ чырвоны
І б'е яго моцна ізноў,
А шал безгранічны ягоны
Замучыць сялянства гатоў.

* * *

Даволі ўжо плакаць напрасна,
Што-ж слёзы памогуць ў бядзе?
Ў магілу нашто йсьці прадчасна?...
А роспач туды давядзе.
Рабы толькі плачуць і стогнуць,
Да сьмерці жывуць, як той скот,
Валы ў ярме толькі сохнуць,
А мы? мы-ж магутны народ!
Дык кіньма жабрачыя позы!
Даволі усьцяж наракаць,
Даволі напрасна ліць слёзы
І ласкі ад злыдняў чакаць.
Лепш выпрастаць спіну сагнуту,
Стаць горда, як рыцар ў баю,
Трэ' зволніць краіну закуту —
Змагацца за волю сваю.
Пара ўжо зраўняцца з усімі,
Пара паказаць, што жывём,
Пара ужо жыць нам з жывымі,
І звацца уласным імём.
Хто мае крыві поўны жылы,
А сэрца любоўю гарыць, —
Ня бойся Салоўкаў-магілы
І сьмела йдзі прышласьць тварыць.

* * *

За краіну сваю,
За нявольны народ,
Ўсей душой пастаю —
Іду ў бой напярод!
Хто-б адважыўся стаць,
З вострым мечам супроць,
І Закон нарушаць,
Таго буду калоць.
Ў абароне сваіх,
Пагарджаных людзей:
Ня жаль сіл маладых,
Ня жаль сэрца-грудзей.
За належны пасад
Між народаў усіх
Буду біцца я рад
З усіх сілаў маіх.
Дык устань беларус, —
Досіць кленчыць ужо;
Скінь чужацкі прымус
І адвечна ярмо.

З Незалежнай Літвы.

Літоўская пэрыядычная прэса. Як сьцьвярджае статыстыка за мінулы 1928 год у незалежнай Літве, бяз вокругу Клайпэды, выходзіла 100 літоўскіх пэрыядычных часопісяў, выдаваных у ліку 441.090 экзэмпляраў.

Вялікая кніга аб літоўскім народным мастацтве выходзе ўжо ў хуткім часе. Кніга будзе мець 300 бачын з 200 ілюстрацыямі. Кніга абойме ўсе аддзелы мастацтва.

Літоўскі ўнівэрсытэт у сёлетнім школьным годзе павялічыўся на 1000 новых студэнтаў.

Новыя дамы. У сёлетнім годзе ў Коўне збудаваны 339 новыя дамы. З гэтага бачым, што Коўна разьвіваецца.

Сколькі ў Коўне расходзіцца часопісяў? У Ковенскіх газэтных кіосках за месяц прадаецца 50.000 экзэмпляраў літоўскіх газэт штодзенных, каля 51.000 экзэмпляраў штодзенных газет у мовах чужых, каля 1000 літоўскіх журналаў, 6.000 штук навуковых часопісяў і каля 2.000 экзэмпляраў журналаў заграгічных.

З Украінскага жыцьця.

Царква ў Жабчы ўжо вернена праваслаўным. Аб падзеях у праваслаўнай царкве ў Жабчы ў свой час мы шырока пісалі. Той, хто чытае „Б. Крыніцу“ добра ведае, што ў мінулую зіму халодныя і галодныя дзеці і старыкі праз нескалькі дзён сядзелі ў царкве дзеля яе абароны. Гэта трагічная гісторыя была скончыўшыся тым, што царква сталася закрытай на даўжэйшы час.

Цяпер царква аканчальна перадана з паваротам праваслаўным.

З Польшчы.

У ўнутранай палітыцы пакуль што ціха. Пасьля бурлівага дня ў Сойме і адкладзінах соймавай сэсіі на 30 дзён—запанавала нейкая цішыня ў польскай унутранай палітыцы. Пілсудзкі напісаў у газэты свой успамін з часоў Японска-Расейскай вайны пад загалоўкам „Wspomnienie o Grzybowie“, у якой гаворыцца аб дзейнасьці ў тыя часы П. П. С. і Пілсудзкага з мэтай перашкодзіць царскім уладам праводзіць мабілізацыю ў Польшчы. Гэты артыкул ня мае нічога супольнага з сучаснасьцяй, аднак многія польскія газэты ўзяліся яго разглядаць і разьбіраць, што да чаго і як. Даходзіць да таго, што некаторыя газэты фатаграфуюць боты „пана маршалка“ і разглядаюць на іх ўсялякія зморшчкі і па гэтых зморшчках пазнаюць характар іх уласьніка.

цаў так і беларусаў, звычайна залічалі да палякоў і часта само наша насяленьне пісалася палякамі, баючыся праваслаўя. Такім чынам у гэных 9,1% палякоў, якіх налічылі ў Ковенскай губ. расейцы, была добрая 1/3 літоўцаў. Але народнае літоўскае адраджэньне гэныя гістарычныя памылкі і палітычныя чужацкія імкненьні ў вялікай меры ўжо направіла і напраўляе далей.

Але ня толькі коштам літоўцаў „Instytut Badań Narodowościowych“ налічыў на ўспомненых землях так многа палякаў. Дакінаў ён гэтага на абшарах вылічаных 8-х паветаў, асабліва на абшарах некатарых з іх, прадусім коштам беларусаў.

Паводле мапаў Інстытуту палякаў жыве ў пав. Дзісненскім у гмінах — Н.-Пагост, Мёры, Леонполь, Чэрэсы, Перабродзе: 50 — 30 прац. У тым-жа павеце ў гмінах: Ёды, Друя, Браслаў і Слабодка: 75 — 50 прац. А тымчасам у гміне Ёды і Друя жывуць суцэльнай масай беларусы, сярод якіх палякоў налічыць можна 10 — 5 проц. У гмінах-жа Браслаў і Слабодка суцэльнай масай жывуць беларусы і літоўцы, сярод якіх палякі так-жа становяць ня больш 10—5 проц.

У павеце Свянцянскім, не гаворачы аб гмінах чыста літоўскіх, дзе Інстытут так-жа вельмі многа налічыў палякаў, гэтых-жа самых палякоў ён налічыў у гмінах — Камаі, Шэметава, Сьвір, Лынтупы, Клюшчаны 75%. А тымчасам, за выняткам двух гмін апошніх, жывуць там суцэльнай масай беларусы. У гмінах-жа Лынтупы і Клюшчаны разам з беларрсамі знаходзяцца так-жа і літоўцы. Палякаў-жа на абшарах гэтых гмін жыве найбольш да 10 проц.

У павеце Ашмянскім у гмінах—Смаргоні, Крэва і Гальшаны Інстытут налічыў палякаў 75 — 50 проц., а ўва ўсіх іншых гмінах таго-ж павету 75 проц. Тымчасам увесь Ашмянскі павет, за выняткам абшараў, дзе жыве многа літоўцай, цалкам беларускі. Літоўцы-ж разам з беларусамі жывуць у гміне Дзявенішкі. На ўсіх-жа землях гэтых гмінаў палякоў найвыжэй 10 проц.

Тое-ж трэба сказаць і аб паветах: Лідзкім і Горадзенсхім, у якіх Інстытут коштам літоўцаў і беларусаў налічыў палякаў пераважна 75 проц., а якіх ёсьць сапраўды ў Лідзкім 10 — 12 проц., а ў Горадзенскім да 15 проц.

Так-жа 75 проц. палякаў налічае Інстытут у Віл.-Троцкім пав., пакідаючы на літоўцаў і беларусаў 25 проц. Тымчасам лічбы гэтыя тады былі-б падобныя да праўды, калі-б іх перакаставіць, г. зн. — калі лічыць на землях Віл.-Троцкага пав. палякоў 25 проц.; і толькі ў ваколіцах Вільні, асабліва ў кірунку заходня-паўночным і крыху паўдзённым, дзе мяйсцовае насяленьне моцна спольшчанае, палякаў можна лічыць значна больш, як 25 проц.

У чым-жа тут справа? Як можа „Instytut Badań Spraw Narodowościowych“ які сябе ўважае за паважную грамадзка-навуковую ўстанову, так рэзка расходзіцца з праўдай? Тлумачыцца гэта безгранічным польскім нацыяналізмам, ад вякоў упрогшым ў свой воз касьцёл каталіцкі. З гэтай статыстыкі мы бачым, што *ўсе* беларусы-каталікі Віленшчыны і Горадзеншчыны без цэрэмоніі залічаны да палякаў.

Да такіх цалкам фальшывых адносна беларусаў вывадаў дайшоў Інстытут, апіраючыся на падставе сьпісу: Цывільнага Ураду Усходніх Зямель 1919 г., на падставе польскага ўрадавага сьпісу 1921 г. і на падставе сьпісу дзяцей школьнага веку, дакананага па загаду мін. Асьветы 1925 і 1929 г.

Нічога дзіўнага, што да гэтакай „праўды“ аб беларусах дайшоў Інстытут, апіраючыся на гэных польскіх статыстыках, якія тэндэнцыйна, часта проціў волі насяленьня ня толькі каталікоў, але нават ня рэдка і праваслаўных пісалі ў палякі. А ўжо аб сьпісах дзяцей, дык і гаварыць няма што. Там вучыцель часта ўсіх дзяцей пісаў у палякі толькі на тэй падставе, што яны каталікі, або што ходзяць у польскую школу, або што жывуць пад Польшчай

Словам, даліся нам у знакі царскія статыстыкі, але горшыя ад іх польскія.

Z.

«Не пакідайце мовы нашай беларускай, каб ня ўмерлі...»

Мацей Бурачок.

З Заграніцы.

У Югаславіі змаганьне Сэрбаў з Харватамі ня спыняецца. Пасьля стралянiны ў югаславускім Сойме, аб чым мы пісалі ў свой час, змаганьні Харватаў з Сэрбамі пачало што-раз то больш паглыбляцца. Дзеля таго, што ўлада ў Югаславіі знаходзіцца ў руках Сэрбаў, Харваты там уважаюцца за бунтаўшчыкоў і церпяць прасьлед. А трэба ведаць, што гэта адзін народ, які толькі раздзяляе рэлігія і рожны шрыфт.

У апошнія часы газэты падаюць, што ў Загрэбі адбываюцца масавыя арышты Харватаў. Лічба арыштаваных перавышае 270 асоб. Арыштаваныя належаць да рожных харвацкіх партыяў. Між арыштаванымі знаходзяцца дырэктары банкаў, прафэсары і рожныя грамадзкія дзеячы. Гэтыя арышты выклікалі сярод Харватаў вялікае абурэньне.

Дня 1 і 2 лістапада ўлады забаранілі сьвяткаваць прыпамінкі харвацкіх народных герояў. Магільнікі былі акружаны войскам і паліцыяй. З магільнікаў сілай выганялі людзей, якія былі зайшоўшы адведаць грабы харвацкіх народных змагароў. Выганяючы людзей з магільнікаў, пазабіралі і вянкі з гробу Радіца, (паўшага ахвярай стралянiны ў югаслаўскім парляманце) якія былі ўжо паложаны харвацкімі арганізацыямі.

У Англіі партыя працы пашыраецца і робіць вялікія ўплывы сярод грамадзянства. Гэтая партыя, як мы ўжо пісалі ў свой час, праз апошнія выбары ў парлямант дайшла да ўлады, а цяпер перамагае і ў выбарах у самаўрады.

С.С.Р.Р. У маскоўскай Акадэміі Навук знайшлі пісьмо, якім цар Мікалай II адрокся ад прэстолу і многа іншых дакумантаў, якія належылі да бы́ўшай тайнай паліцыі а так-жа да цэнтральнага камітэту кадэтаў і эсэраў.

Некаторыя з гэтых дакумантаў маюць яшчэ і цяпер вялікае значэньне для бальшавікоў у барацьбе з контррэвалюцыяй.

Дакуманты гэтыя да гэтай пары ў маскоўскай Акадэміі Навук перахоўваліся нелегальна. Бальшавіцкія ўлады зволнілі цяпер з становішча сэкрэтара Акадэміі Навук сябру той Акадэміі Ольдэнбурга за тое, што ён ня выявіў гэтых дакумантаў уперад.

Бальшавікі нарэквізавалі 900 тысяч вагонаў збожжа. Камісар гандлю падаў да публічнага ведама, што ўжо цяпер сабрана „хлебазагатоўкай" 9 мільёнаў тон збожжа, лічба якая выносіць 60 проц. сёлетняй „хлебазагатоўкі". Камісар спадзяецца, што сёлета плян „хлебазагатоўкі" будзе выкананы цалкам.

Як гэтыя „хлебазагатоўкі" адбываюцца, мы ўжо пісалі. Даволі падаць той факт, што ў апошнія часы бальшавікі расстралялі 23 асобы толькі за тое, што яны, баронячы свой хлеб, выступалі з аружжам проціў чыноўнікаў „хлебазагатоўкі" і сусім стане ясным, як бальшавікі выконываюць свой „хлебазагатовачны" плян.

З Вільні.

Юбілей 25-гадовай публіцыстычнай працы п. Людвіка Абрамовіча. У мінулую суботу 9 г. м. прыяцелі і знаёмыя п. Людвіка Абрамовіча абходзілі 25-ці летнiе ягонай публіцыстычнай працы. П. Людвік Абрамовіч ёсьць рэдактарам „Przegląd Wileńskiego". Хто чытае гэту часопісь, той бача, што рэдактар яе — гэта вялікі патрыёт нашага краю, а так-жа прыяцель адраджаючыхся, народаў насяляючых наш край, — беларусаў і літвіноў.

Рэдакцыя „Беларускай Крыніцы" у 25-ыя ўгодкі публіцыстычнай працы п. Людвіка Абрамовіча выражае Яму сваё пажаданьне вытрываласьці ў далейшай яго ідэйнай і так цэннай працы.

Маніфэстацыя П.П.С. У мінулую нядзелю з прычыны 25 угодкаў першага аружнага выступленьня П.П.С. у змаганьні з царызмам, віленскія пэпэасы ладзілі ў Месцавай Салі акадэмію. На гэтай акадэміі прамаўлялі многія павадыры віленскіх пэпэасаў, а так-жа выступаў хор і аркестра. Пасьля акадэміі ўфармаваўся паход у ліку каля 1000 асоб, які прайшоў па вуліцах Вільні. У часе паходу гучна грымелі клічы — „Хай жыве маршалак Дашынскі!" — „Хай жыве Сойм!"

Да нас пішуць.

УСЁЖ-ТАКІ ПАМАГЛО.

Журыхі, Вялейскага пав. Як ужо ведама чытачом „Б. Крыніцы" у нашай вёсцы ёсьць урадавая беларуская школа. Школьная сетка нашай школы абыймае вёскі: Журыхі, Астравы і Нова-Зімодры.

У гэтым годзе інспэктар школьны быў прыслаўшы ў нашую беларускую школу вучыцельку-польку, якая па беларуску ні слова ні мэ няўмела. Убачыўшы такую нябывальшчыну, нашы сяляне-бацькі дзяцей-вучняў аб гэтым далі знаць у Беларускі Інстытут Гаспадаркі і Культуры. Нехта з нашых змагароў за родную беларускую школу напісаў у газэту „Б. Крыніцу" і адначасна бацькі дзяцей зьвярнуліся да школьнага інспэктара ў Вялейцы, каб вучыцельку-польку ад нас забраў і прыслаў вучыцеля-беларуса.

Дамаганьне направы недарэчнасьці пачалося ўсебакова: праз газэту, Беларускі Інстытут Гаспадаркі і Культуры і арганізаванае дамаганьне бацькоў, беларускага вучыцеля. Такім парадкам слушныя нашы дамаганьні зьдзейсьнены. На мейсца вучыцелькі-полькі прысланы ўжо ў нашую школу вучыцель-беларус. Блізкі.

АД РЭДАКЦЫІ. Гэтае стойкае дамаганьне сялян вёсак: Журыхі, Астравы і Нова-Зімодры няхай будуць прыкладам для іншых не толькі ў справе такой-жа, але і ў ва ўсіх галінах нашага жыцьця.

ТРЭБА ШАНАВАЦЬ СЬВЯТАСЬЦІ І СЬВЯТОЕ МЕЙСЦА.

Везовіцэ, Навагрудзкага пав. У нас ёсьць царква. Яна ня дарма ў нас называецца сьвятыняй. Гэта царква так узгадавала цэлыя пакаленьні нашых людзей цьвёрда веруючымі хрысьціянамі-праваслаўнымі, што ад гэтай сьвятой веры не адстрашыць нашых людзей і нядобры духоўнік. Ворагі навукі Хрыста і сьвятой Яго царквы, каб аслабіць веру ў сьвятую навуку Хрыста, ставяць часта закід праўдзе сьвятой веры злыя паступкі духоўніка. Гэта падыход да аслабленьня веры вельмі хітры і можна сказаць удалы. Але-ж нашы людзі добра ведаюць, што духоўнікі яшчэ ня ёсьць тая праўда навукі Хрыста. Духоўнікі так, як і ўсе людзі могуць быць добрыя і злыя. Дзеля таго, што духоўнік або не шануе сьвятасьці сьвятой веры, або не адпаведна паступае пры выкананьні сваіх абавязкаў, ня ёсьць віна рэлігіі. Наадварот. Рэлігія, як была чыстатой праўды Божай так і ёсьць, а толькі паступкі духоўніка нядобрыя. Нашы людзі дасканальна ў гэтым разбіраюцца і добра ведаюць, што вера ад духоўнікаў ня ёсьць залежнай, бо яна цалкам паходзіць ад самога Бога. Ведаюць нашы людзі і тое, што духоўнікі часта стараюцца рэлігію выкарыстоўваць для палітыкі, як гэта ёсьць цяпер у нас, што царква служыць расейшчыне. Ведаюць нашы вясковцы і тое, што духоўнікі ня пускаюць у царкву нашай беларускай мовы. Гэта для нас крыўда, але гэтаму наша праваслаўная вера ня вінавата, а вінаваты толькі палітычныя абставіны і духоўнікі. Бо вера праваслаўная ёсьць верай і беларусаў, а ня толькі маскалёў. Дзеля таго, што вера праваслаўная ёсьць верай і нашай, мы павінны яе бараніць. А бараніць яе трэба ад усіх яе ворагаў.

Пры гэтым трэба старацца, каб яна ў нас ня была верай „рускай", а верай праваслаўнай. Гэта знача, каб на Беларусі ў праваслаўнай царкве была навука слова Божага не па расейску, а па беларуску.

Праваслаўны парахвіянін.

ПРЫЧЫНЫ ЗЛА.

Крэва, Ашмянскага пав. Па моему, дык найгалаўнейшай прычынай зла ёсьць гарэлка. Дзіўна неяк, што нашы людзі невавілаючы зло, не высьцерагаюцца прычыны зла. За разбоі, кражу, забойства і распусту нашы людзі заўсёды наракаюць, а за п'янства дык і маўчаць. Выпіць — кажуць, у часе трэба. Сьмешнае і дзіўнае гэта паняцьце. Я ня памятаю, каб дзе цьвярозыя ды пабіліся. Дзе была бойка, то заўсёды ўперад там была гарэлка. Ніколі ня бывала, каб сьпярша пабіліся, а пасьля пілі гарэлку. З гэтага ясна, што гарэлка ёсьць прычынай зла.

У нас нядаўна быў такі выпадак, што баль, які пачаўся з гарэлкай, кончыўся з нажамі ў руках. Напіўшыся да п'яна, бяседнікі заспорылі. Ад слова да слова дайшло да кулакоў, ад кулакоў аж да нажоў. У выніку такой бяседы — два паўсьмерці раненыя людзі.

Трэба змагацца з злом, бо яно людзей пагубіць, калі людзі яго не перамогуць. Але ў першую чаргу трэба змагацца з прычынамі зла. С—к.

„МУДРЫ" ПІСАР.

Будслаў, Вялейскага пав. Наша мястэчка, гадоў таму дзесяць, было вогнішчам беларускага адраджэнскага руху ў Вялейшчыне. Была ў нас беларуская гімназія, быў сталы аматарскі тэатр, які што два тыдні ладзіў прадстаўленьні. Гэты тэатр адведываў і суседняе вялікае мястэчка Даўгінова, дзе так-жа ставіў прадстаўленьні. Быў тады ў нас і беларускі хор. Гэты хор выступаў на сцэне нашага тэатру (ваенны барак быў будынкам тэатру) выконваючы беларускія народныя песьні. Гэты хор сьпяваў і ў касьцеле рэлігійныя беларускія песьні. Былі так-жа ў нашым касьцеле і казаньні па беларуску. Агулам кажучы жыцьцё беларускае кіпела і разыходзілася шырока па Вялейшчыне. Але прыйшоў час і гэта праца была спынена.

Здавалася, што беларусы ізноў заснулі, так як спалі ўпярод. Прайшло некалька гадоў магільнай цішы. Зьмяняліся ўлады, зьмяніліся і людзі.

У апошнія гады пачаўся каля нашага мястэчка адживаць беларускі нацыянальны рух на нова. Пайшла шырока па вёсках беларуская газэта, пераважна „Б. Крыніца". Пачалі арганізавацца культурна-прасьветныя гурткі Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры. Народ закратаўся каля роднай беларускай справы.

Многім прыбышом гэта не спадабалася. Але разумнейшыя з іх на гэту справу глядзяць з поўнай цярплівасьцяй і стараюцца зжыцца з нашымі людзьмі. А гэтак званыя „мудрыя" прыбышы, дык проста і адкрыта выступаюць проціў праявы беларускага адраджэнскага руху.

Найбольш сваей „мудрасьці" праяўляе гмінны пісар. Ён дык адкрыта страшыць сялян, каб сьцерагліся беларушчыны. Ці гэта абдумана ці з прастаты сваей „мудрасьці" публічна заяўляе, што і культурна-прасьветная праца гурткоў Бел. Інстытуту Гаспадаркі і Культуры ёсьць нелегальшчынай. Каб ня быць галасло́ўным мушу паказаць гэты факт. Гэта было 26 мінулага месяца на пошце, дзе „мудры" пан пісар заявіў — што праца „Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры ёсьць справа нелегальная.

„Мудрасьць" і праўная „веда" гэтага пана разнясласа па нашых ваколiцах з вялікім зьдзіўленьнем. сяляне толькі дзівяцца гэтакай „мудрасьці" пана пісара.

Сапраўды, калі-ж гэта ўлегалізуецца ў галовах падобных паноў тое, што ня ёсьць польскае? Калі-ж гэтыя „мудрыя" галовы адвыкнуць ад шовіністычнага чаду? Здаецца пара ўжо! Бо такія пагляды ня столькі нам шкодныя, сколькі дзіўна сьмешныя.

Будслаўскі.

Танная прадажа беларускіх кніг.

БЕЛАРУСКАЯ КНІГАРНЯ «ПАГОНЯ»

(Вільня, Людвісарская № 1)

ладзіць танную прадажу беларускіх кніг, якіх сьпіс кнігарня высылае, хто прышле на гэта марку на 10 гр.

Кнігарня на кожнай з празначаных для таннай прадажы кніг робе значную ўступку, а на некаторых уступае палавіну (50 проц.) Танная прадажа ўжо пачалася і будзе трываць да 1. XII. 1929 г. Грамадзяне, пасьпяшыце скарыстаць з гэтай рэдкай аказіі.

Увага: Кніжкі высылаюцца поштай па атрыманьні ўсей вартасьці заказу, або накладной платай (za pobraniem) па атрыманьні аднэй трэцяй часткі вартасьці заказу.

Рэдактар Янка Пазьняк. Бел. Друк. ім. Фр. Скарыны Вільня, Завальная 6—10. Выдавец Альбін Стэповіч